ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 40 (1007) ПАНЯДЗЕЛАК, 17-га лютага 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.

„ДАЁШ САВЕТЫ У ПАРЫЖЫ“

Масавыя мітынгі пратэсту супроць падрыхтоўкі нападу на СССР

ПАРЫЖ, 16. Учора ў рабочых раёнах Парыжу адбыліся арганізаваныя компартыяй масавыя мітынгі протэсту супроць антысавецкага цкаваньня і супроць падрыхтоўкі францускай буржуазіяй нападу на Савецкі Саюз. Мітынгі, на якія зьбіраліся больш 1000 рабочых, прайшлі з вялізарным уздымам і выявілі выключную популярнасьць лёзунгу абароны Савецкага Саюзу. Тысячы рабочых адказвалі на выступленьні прамоўцаў выкрыкамі: **„Абаронім Савецкі Саюз“, „Даёш саветы ў Парыжы“, „Вызваліце з турмы тав. Марці“, „Няхай жыве компартыя“.**

Усебеларускі зьлет „легкай кавалерыі“

„ЛЕГКІЯ КАВАЛЕРЫСТЫЯ“—

актыўныя барацьбіты за ператварэньне пяцігодкі ў чатырохгодку, барацьбіты за суцэльную калектывізацыю вёскі, памочнікі партыі ў ліквідацыі кулацтва, як клясы

Накіроўвайце агонь супроць скажэньняў клясавай лініі

БЫЦЬ ЛЕПШЫМІ ПАМОЦНІКАМІ ПАРТЫІ У АЖЫЦЬЦЯУЛЕНЬНІ ЯЕ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ

ПРАМОВА ПРАДСТАЎНІКА ЦКК УсеКП(б) І ЦК УсеЛКСМ тав. САЙКІНА

Ад імя Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі і Цэнтральнага Камітэту УсеЛКСМ перадаю ўсебеларускаму зьлёту нашае ПАЛКАЕ ТАВАРЫСКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ.

Ваш зьлёт павінен мобілізаваць увагу ўсёй „лёгкай кавалерыі“ Беларускай рэспублікі на тое, каб на аснове выразнай барацьбы за генэральную лінію партыі, на аснове організацыі мас навокал выкананьня генэральнай лініі партыі, мы праводзілі-б нашу практычную работу кожны дзень, кожную гадзіну, каб роля „лёгкай кавалерыі“, як барацьбіта з бюрократызмам, і аўтарытэт „лёгкай кавалерыі“ выяўляўся кожны дзень, кожную гадзіну на аснове яе вялікай творчай работы.

Зараз мы з вамі жывем у абставінах надзвычайна цяжкіх, у абставінах абвастраючайся клясавай барацьбы, у абставінах, калі мы ўзяліся за самыя жывыя карэньчыкі рэшткаў капіталізму ў нашай краіне.

Мы паставілі перад сабою задачу разьбіць у адкрытай бойцы астаткі капіталізму, астаткі яго клясы ў асобе кулацтва. Гэта патрабуе ад кожнага „кавалерыста“ уменьня разьбірацца ва ўсёй складанай абстаноўцы, уменьня разьбірацца ва ўсёй суме тых баявых задач, якія паставіла партыя перад намі; гэта патрабуе таго, каб наша работа—работа „лёгкай кавалерыі“, як форма масавага рабочага кантролю, месьцілася ў тым, каб мы дапамаглі партыі змагацца за ажыцьцяўленьне яе генэральнай лініі, каб мы дапамаглі партыі ў адкрытай сутычцы клясавай барацьбы біць і дабіваць рэшкі капіталізму ў нашай краіне.

Задача нашага зьлёту ў тым, каб вы сабе політычна яшчэ больш заразілі, каб вы, разьяжджаючыя на месцы, далі баявы пароль усім „кавалерыстым“ працаваць узброенымі ленінізмам, працаваць так, каб кожны крок, кожны налёт, які вы будзеце праводзіць, праводзілі пад кутом погляду таго, наколькі правільна праводзіцца генэральная лінія партыі на практыцы, наколькі вам удалося падняць клясавую баяздольнасьць—ГЭТА ПЕРШАЯ ЗАДАЧА.

ДРУГАЯ ЗАДАЧА, задача організацыі мас моладзі—комсамольцаў, беспартыйнай рабоча-батрацкай і бядняцкай моладзі і дарослых рабочых навокал барацьбы з бюрократызмам месьціцца ў тым, каб назаўсёды сапраўды стаць масавай організацыяй для таго, каб „лёгкая кавалерыя“ не складала сабою ячэйку ў 5-6 чалавек комсамольцаў, але, каб праз групу „лёгкай кавалерыі“ ўцягнуць усе масы комсамольцаў і беспартыйнай моладзі. Гэта—другая задача.

Мы, як вучні Леніна, не павінны забыцца слоў Уладзіміра Ільліча аб тым, што толькі пры ўмове ўцягненьня мас мы здолеем перамагчы бюрократызм у нашай краіне.

І ТРЭЦЯЯ ЗАДАЧА—гэта на аснове барацьбы за правядзеньне прамфінпляну, на аснове барацьбы за чыстату дзяржаўнага апарату, за ліквідацыю кулацтва, як клясы, намеціць правільныя формы і мэтады нашай работы.

Зараз мы павінны зразумець, што мы ўжо перарасьлі тое, што было год таму назад, што было два гады таму назад. Зараз мы павінны праводзіць наша будаўніцтва больш дэталёва, больш падрыхтавана, з большай упартасьцю, каб зьнішчыць недахопы, зьнішчыць само няўменьне даводзіць справу да канца.



Тав. САЙКІН

Мы павінны паказаць уменьне змагацца за лінію нашай партыі, мы павінны паказаць уменьне даводзіць справу да канца. Мы павінны зрабіць нашу работу больш галосай і больш зьвязанай з усімі рабочымі масамі; мы павінны працаваць у імя ўцягненьня мас у барацьбу з бюрократызмам.

Дазвольце таварышы, пажадаць вам, хто знаходзіцца на мяжы Савецкага Саюзу, каму першымі прыдзецца выйсьці на абарону Савецкага Саюзу, каб „лёгкая кавалерыя“ Беларускай Савецкай Рэспублікі на фронце барацьбы з бюрократызмам заваявала ня меншую славу, чым будзёнаўская кавалерыя на фронце грамазянскай вайны. (Воплескі).

ПРАМОВА СЭКРАТАРА ЦК ЛКСМБ тав. ПАЛЯКОВА

Мы перевыканалі з перавышэньнем пляны першага году пяцігодкі. Мы ідзем шпарка па шляху індустрыялізацыі краіны. Агромністы рух бядняцкіх, батрацкіх і серадняцкіх мас вёскі па колектывізацыі сельскай гаспадаркі перавысіў усе нашыя плянавыя мэркаваньні. У зьвязку з гэтым на грунце **СУЦЭЛЬНАЙ КОЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ЦЭЛЫХ АКРУГ і РАЕНАЎ**, партыя высунула лёзунг, які мы зараз праводзім,—**ГЭТА ЛІКВІДАЦЫЯ КУЛАЦТВА ЯК КЛЯСЫ.**

Усё гэта праходзіць ва ўмовах жорсткай абвостранай клясавай барацьбы, што патрабуе ад нашага саюзу яшчэ большага ўзмацненьня сваёй клясавай баяздольнасьці і мобілізацыі сіл на барацьбу за генэральную лінію партыі, на барацьбу з усялякімі ад яе адхіленьнямі, і асабліва небясьпечным на даным этапе - правым опортунізмам і беларускім нацыянал-дэмократызмам.

Першы зьлёт павінен зьявіцца падмуркам узмацненьня руху „лёгкай кавалерыі“.

Мы будзем яшчэ больш патрабаваць ад нашай „лёгкай кавалерыі“ і ад усяго комсамолу — падпарадкаваньня сваёй работы справе ажыцьцяўленьня грандыёзных задач соцыялістычнага будаўніцтва.

Дазвольце-ж выказаць упэўненасьць, што першы ўсебеларускі зьлёт тыя задачы, якія стаяць перад ім, поўнасьцю **ВЫРАШЫЦЬ.**



Прэзыдыум зьлёту

Вачыма дэлегата

(З залі паседжаньня зьлёту «лёгкай кавалерыі»)

... Тав. Лазоўскі пачаў свой даклад. Дэлегаты ўважліва слухаюць. Шэраг фактаў бюрократызму выклікаюць здаровы сьмех хлапцоў. Асаблівы сьмех выклікаў факт з настаўнікам Замулкіным, які быў у свой час клясным настаўнікам у гімназіі, чыноўнікам у кантрольнай палаце, загатоўцам сена і нарэшце выпадкова стаў... інспэктарам РСІ. Калі гэтага самага Замулкіна вычысьцілі з апарату, ён падаў заявы ў... ЦКК, СНК, ЦВК. Дзесяткі людзей займаліся гэтай справай і яшчэ на сёньня няма канчатковага рашэньня гэтага пытаньня. Даўно трэба было вычысьціць Замулкіна, даўно трэба было канчаткова вырашыць гэтую справу, аднак шэраг установаў займаюцца непатрэбнай справай Замулкіна.

... Ад ЦК УсеЛКСМ вітае тав. Сайкін.

Яго кароткае гарачае прывітаньне добра запамінаецца кожнаму дэлегату, а асабліва заключныя словы

— Няхай „лёгкая кавалерыя“ так-жа сьмела і настойліва ідзе да перамогі на фронце барацьбы з бюрократызмам, як будзёнаўская кавалерыя ішла ў баі і перамагала ў час грамадзянскай вайны.

Гучныя воплескі пакрываюць апошнія словы тав. Сайкіна.

На другі дзень мы слухалі т. Палякова.

Факты з яго дакладу гаварылі аб добрым, а часта і дрэнным у рабоце „лёгкай кавалерыі“.

Дэлегаты запісваюць свае ўражаньні ў блёк-ноты—рыхтуюцца да спрэчак.

Прэзыдыум закідваецца пісулькамі з просьбай даць слова.

***

... На трыбуне стары рэчыцкі рабочы тав. Фэйгенсон. Яго простыя словы гучна нясуцца ў аудыторыю.

— Я стары, але адчуваю сябе як комсамолец.

Ён расказвае аб працы „лёгкай кавалерыі“ на заводзе імя Томскага, заклікае займацца ня толькі выкрыцьцём недахопаў, але непасрэдным і актыўным удзелам у соцыялістычным будаўніцтве. Ён заклікае ўдзяліць больш увагі рацыяналізатарскаму руху.

— «Лёгкі кавалерыст“—прыкладны ўдарнік на заводзе—так канчае сваю прамову т. Фэйгенсон.

Нечакана ўзяў слова прадстаўнік ви памятаем якой дэлегацыі. Ён сказаў усяго пару слоў:

— Дэлегацыя па выкліку „Чырвонай Зьмены“ ўносіць столькі-та рублёў на пабудову комсамольскай падводнай лодкі. Выклікаем пасьледаваць нашаму прыкладу астатнія дэлегацыі“.

Гэтыя словы, як хваля, пракаціліся па залі—энтузіазм ахапіў усіх

Адна за другой дэлегацыі адказваюць на выклік і ўносяць грошы на лодку.

Праз 10 хвілін усе дэлегацыі адказалі на выклік.

... Ужо сабраны ўсе сродкі, а дэлегаты яшчэ жывуць пачуцьцём толькі што праведзенага збору на падводную лодку, якая будзе абараняць межы савецкай краіны.

Зьлёт не падобен трохі на нашы звычайныя зьезды, зьлёт праходзіць бадзёра, жвава, сапраўды так, як трэба праходзіць зьлёту слаўнай „лёгкай кавалерыі.

Ц. Верны
Б. Арчын

Зьлетаускі дзеньнік

* Учора на ранішнім пасяджэньні з прамовай выступіў загадчык АПАД ЦК КП(б)Б т. Сянькевіч, які завастрыў у сваей прамове пытаньне аб задачах „лёгкай кавалерыі“ ў сучасны пэрыод.

* За т. Сянькевічам з дакладам аб становішчы работы кіраўніцтва „ЛК“ і ўдзелу КСМ у барацьбе з бюрократызмам выступіў адказны сэкратар ЦК ЛКСМБ т. Палякоў.

* У спрэчках па дакладу т. Лазоўскага і т. Палякова запісалася каля 30 чалавек. На ранішнім пасяджэньні выказалася каля 12 чалавек.

* Ад імя атраду „лёгкай кавалерыі“ пры фабрыцы імя Клары Цэткін (Гомель) зьлёту рапартаваў т. Шандарэй.

* Гучнымі воплескамі сустракаецца прамова сэкратара ЦК т. Васілевіча.

* Зайграў марш! Усе прысутныя ў залі паўсталі з сваіх месц і накіравалі свае погляды на ўвайшоўшых у залю комсамольцаў Кастрычнікавага раёну.

* Ад імя Кастрычнікаўскай з комсамольскай організацыі зьлёт вітае комсамолец шкляной гуты „Пролетарый“ т. Герчыкаў.

* Зьлёт пастанавіў паслаць прывітальныя тэлеграмы ЦК КП(б)Б, ЦК УсеЛКСМ і „Комсомольской Правде“.

Вясёлы куток

З галавы ўсе жыцейскія дробязі выляцелі. Уласна кажучы ня выляцелі, а дэлегацкі білецік іх выштурхнуў. Думаеш толькі аб адным, аб усебеларускім зьлёце... Думкі пачалі працаваць ужо ва ўсебеларускім маштабе.

***

Ноччу прачнуўся Не ад думак, не ад дрэннага сну. Ад блох праклятых!

Пасьля гэтай ночы ў мяне жаданьне выказацца ў спрэчках. І крыць ня толькі бюрократаў, шкоднікаў савецкай улады, але і тых, якія далі нам гэтыя пакойчыкі.

***

— Гэй, чорт! зусім забыў. Патрэбна ўнесьці прапанову, каб замест таго, што-б глядзець халтуру гуртка клюбу савгандслужачых (якія толькі псуюць настрой у час адпачынку), організаваць добры вечар самадзейнасьці.

...ТАК НАРАДЗІЛАСЯ ПЕРШАЯ БРЫГАДА-КОМУНА

СЛОВЫ: „СВОЙ“, „ТВАЕ“ ЗАМЯНІЛІ СЛОВАМІ: „НАША“, „МЫ“

Патрэбна больш увагі, клопату і штодзеннай дапамогі з боку комсамолу і ўсяе пролетарскае грамадзкасьці ім—гэтым конкрэтным пачынаньням комуністычных адносін і організацыі работы

1. „Мы—ударнікі“

Перашуршуквaецца рубанак з дрэвам пад хуткімі ўзмахамі маладых рук... Працяжна ўздыхаюць пілы, урэзаўшыся ў дрэва. Долато пад ударамі клінкі дзяўбе дзятлам... Усяго ў цэху 30 варштатаў. Многія з іх пяюць свае песьні. На гэтым фоне працы няпрыемна кідаюцца ў вочы некалькі вольных варштатаў з бязладна раскіданымі інструмантамі,—гаспадары нейдзе ва ўборнай цешацца зацяжкай папяросы.

А вось з гэтых апошніх адзін тут „працуе“. Ён нізенькі, юркі, галава яго заўсёды выцягнута. Гэта—вечны „пасыўны актыў“. Зараз ён перабраў усе брускі, што ляжалі на варштаце, аірнуў пад варштат і куляй паймчаўся да гадзіньніка. Бяз дзьвёх хвілін 9. Азірнуўшыся, ён крыкнуў.

— Дзяжурны!—што ты сьпіш, ужо час званіць на перапынак.

— Яшчэ дзьве хвіліны... адказвае той, паглядзеўшы на гадзіньнік.

— Падумаеш, дакладнасьць якая... і ён заварчаўшы пашоў да свайго варштата.

Да старасты групы падышоў сябра вучкому М.—Слухай.. Зараз. у часе перапынку, патрэбна склікаць усіх вучняў і абмеркаваць выклік першай кацельнай групы.

— Добра...

Зазваніў званок. Побач, у кацельнай, забілі па рэйцы. Перапынак на 10 хвілін. Цэх пачаў сьціхаць. Толькі гудзеў матор і паплюхвала вадой тачыла. Разыходзіліся вучні ад сваіх варштатаў.

— Таварышы! Не разыходзьцеся. зараз зробім невялічкі сход—спыняў староста выходзячых вучняў.

— Пашоў ты са сходам, а курыць калі? — агрызнуўся „пасыўны актыў“. Ніхто з вучняў не зьвярнуў увагі на яго словы. Усе разьмясьціліся на лаўках. Прадстаўнік ад вучкому чытаў пункты выкліку. Сход слухаў. Толькі „пасыўны актыў“ шныраў усюды носам. Выклік прынялі. Хацелі разыходзіцца. Раптам пачуўся заклік—пачакайце! Яшчэ ня ўсё!—спыніў староста. Вышаў вучань той-жа групы з сьпісаным лістом у руках, адкінуўшы кучаравыя валасы з ілба, пачаў чытаць:

> „Мы ніжэйпадпісаныя абвяшчаем сябе ўдарнай брыгадай у ФЗВ і бярэмся выканаць наступныя пункты:
>
> 1. 100 проц. пасьпяваньне па тэорыі і вытворчасьці.
> 2. Ніводнага прагулу.
> 3. Сачыць за парадкам на варштаце і наўкол яго.
> 4. Актыўна ўдзельнічаць у рабоце гурткоў.
> 5 Актыўна ўдзельнічаць у грамадзкай рабоце.
> 6. Усім уступіць у сябры розных грамадзкіх таварыстваў.
> 7. Ніводнага, хто-б не падпісаўся на 3-ю пазыку індустрыялізацыі“.
>
> Пункты падпісалі:
>
> А. Бунін, Т. Мар
> В. Пепік, Ал. Шваба, Ф. Хамскі.

— Я ня прымаю выкліку!—выступіў супроць „пасыўны актыў“. Чытаўшы засьмяяўся:

— Ды мы ў цябе і не запытваемся пра гэта. я толькі давожу да ведама, што мы—ударная брыгада.

— А калі і я хачу запісацца ў яе, —запытаў нехта - аб гэтым потым.

Ізноў зазваніў званок, перапынак скончыўся. Вучні разышліся.

— „Ударнікі“—чулася іранічна ад некаторых. Ударная пяцёрка заняла свае месцы. Вось іх пяць гарачых галоў, схіленых над варштатамі. На ілбу ў іх пачала зьяўляцца раса поту. Але хто на гэта зьверне ўвагу, калі ў руках „перашуршуквaецца рубанак з дрэвам“. „працяжна ўздыхаюць пілы“, „долата пад ударамі клінкі дзяўбе дзятлам“.

Пяць чалавек сваім „ударам“ ускалыхнулі школу! Выступіў вучань другой сьлясарнай групы:

— Мы прымаем выклік першай сталярнай і становімся ўдарнай групай.

За імі выступілі вучаніцы: Зьлінеўская, Мільлер, Надольская і Пухоўская выклікалі на соцспаборніцтва вучняў гэтай-жа групы: Антонава, Бузу, Бровзжука і Барысава.

Раскачалася школа:

— Сіман'янц, Сай, Шаўловіч—абвясьцілі сябе ўдарнікамі беларусізацыі.

Заварушыліся і брыгаднікі:

— „Да сканчэньня школы адлічваем процант сваёй заробчай платы ў фонд індустрыялізацыі і выклікаем зрабіць гэта-ж усю школу“.

Прамову брыгадніка захлеснула хваля воплескаў. Уся школа (ня выключаючы інструктароў і пэдагогаў). прыняла гэты выклік. Гэтак школа, пачаўшы ўдарнічаць пяцьма, зрабілася ўся ўдарнай.



Старшыня „СНК“ брыгады-комуны Мар.

Да ўсяго гэтага магутным акомпанімэнтам нясецца са двара вагоннапаравоза-рамонтнага заводу „кулямётная перапалка кацельшчыкаў“.

Гэтак нарадзілася першая па ўсім ФЗВ чыгуначнікаў ударная брыгада вучняў.

2. Пералом

Скончыўся першы трымэстар. Выводзілі графікі работы школы. Запаўнялі ведамасьці для Калугі. Аказалася, што па соцспаборніцтву апраўдала сябе толькі ўдарная пяцёрка Распусьцілі вучком. Распусьцілі камсод (камітэт па садзейнічаньню соцспаборніцтву). Кіраўніцтва спаборніцтвам перайшло ў рукі ячэйкі і новага вучкому. Прайшоў водпуск. Вучні ізноў вярнуліся да сваіх ціскоў і варштатаў. Склікалі сход школы. Пасьля інформацыі заг. школы аб дарожнай конфэрэнцыі выступілі член ударнай брыгады.

> — „... Таварышы!!! Абвясьціўшы сябе ўдарнай брыгадай, мы выканалі ўзятыя на сябе пункты. Цяпер мы абвяшчаем сябе ўдарнай брыгадай-**КОМУНАЙ**. У нас у пакоі няма слоў: „свой“, „твае“. Мы гэтыя словы зьнішчаем і замест іх уводзім новыя: „наша“, „мы“. У нас няма палучкі „тваёй“, а ёсьць палучка „наша“. якая ідзе ў касу комуны...“

3. Подых комуны

Маленькі пакойчык у цэнтры агульнажыцьця. Адно вакно. Ля вакна стаіць адзін ложак. Два ложкі стаяць уздоўж дзьвюх бакавых сьцен. Пасярэдзіне стол. І ўсё тут у пакоі, ня гледзячы на некалькі тумбачак, шафаў, дастаткова „вольнага“ месца: 4 крокі можна прайсьці ад дзьвярэй да стала,—ні за што не зачапіўшыся.



Намесьнік старшыні „СНК“ Шваба

— Ну, дык калі мы пачнем жыць комунай поўнасьцю—у палучку ці зараз?

— Давайце і зараз.

— Можна.

Комунары сядзелі на сваіх ложках. Той, хто гаварыў, стаяў ля стала. Хамскі сядзеў на сваім ложку, астатнія тры паўлежачы адпачывалі. Шваба стаяў ля стала і працягваў:

У такім выпадку, нам патрэбна абраць свае органы кіраваньня.

Комунары назвалі іх „ЦВК і Савнарком“...

— Ды навошта? Будзь ты старшым, як староста пакою...

— Не! Трэба абраць новых...

Усе падсунуліся да стала і праз 20 хвілін дэбатаў і галасаваньня падпісалі паперу, у якой напісана:

> **Пратакол І зьезду комунараў**
>
> Прысутнічалі: Бунін, Мар, Пепік, Шваба. Хамскі.
>
> Слухалі: Аб абраньні органаў праўленьня комуны...
>
> Пастанавілі: 1. Абраць старшынёй „ЦВК“ Хамскага, намесьнікам—Буніна, старшынёю „Савнаркому“—Мар, намесьнікам—Шваба, „ВСНГ“ (проста заг. гаспадаркай)—Шваба і Пепік.
>
> Подпісы
>
> 31/І-30 г.

„Савнарком“ заняўся распрацоўкай „бюджэтнага году“. Вылічылі, што на „шамок“ аднаго чалавека патрэбна патраціць у месяц 18 руб. 58 кап. (пры строгім рэжыме эканоміі), значыцца на ўсю комуну ў месяц пойдзе 92 руб 90 кап.

— Ого-го!—прыўстаў Пепік на ложку, апусьціўшы свае доўгія ногі на падлогу. Сумка нішто сабе! „А што, каб чалавеку пазбавіцца страўніка“— з жалем аб немагчымасьці прагаварыў Бунін. Ноч паступова зацягвала вокны чорным палатном. Запалілі электрычную лямпачку. Закончылі сёньнешні дзень разьмеркаваньнем абавязкаў. „Савнарком“ павінен кіраваць усім жыцьцём комуны, а „ВСНГ“ весьці ўсю гаспадарчую частку.

4. „А лыжкі“

На заўтра аб 11 гадзіне ўся комуна стаяла перад загадчыкам школы:

— Нам патрэбна: дзьве каструлі (хадзіць па абед), 10 талерак, 5 нажоў, 5 відэльцаў, 5 лыжак. Заг. школы падлічваў колькі гэта абыйдзецца, але адмовіць ня мог.

— Ідзеце да справавода,—ён усё купіць.

Хлапцы вываліліся ў калідор. А праз паўгадзіны „Савнарком“ стаяў перад комунай і, аглядаючы новенькую каструлю гаварыў:

— О, якая беленькая!.. Толькі лыжак не дастаў. Ёсьць, але „дзяшовыя“ — у адзін рубель.

— Як-жа будзем шамаць?

— А як-небудзь, к вечару справавод сказаў—купіць.

Весткі аб комуне разьнесьліся па ўсёй школе. У майстэрні іх сустракалі:

— Здарова, комунары!

— Вось толькі, як вы лахаць (ухаджваць) будзеце? Таксама комунай?—пыталіся аматары гэтага занятку.

— Усе за аднэй, па пяцідзёўцы!—жартавалі комунары.

5. „Як пульс“...

Пасьля 4 гадзін дзьверы маленькага пакою забразгалі, як ніколі. Усё агульнажыцьцё глядзела і дзівілася, што тут такое? Вось дзяжурны і яшчэ адзін пашлі некуды з каструлямі, а хутка на стале задыміў боршч. Адзін пабег за хлебам у коопэратыў, другі раст уляў пасуду, лыжкі дасталі ў дзяўчат...

Мільгацелі лыжкі, пусьцела каструля, меншала хлеба. Зьвязалі нажы і відэльцы.

Пасьля абеду дзяжурны пачаў прыбіраць. Заблішчэў стол чыстай цыратай, пасуда ў „падпольлі“. Комунары ляглі адпачываць.

Пепік прытрымліваў дзьвюма рукамі свой жывот, нібы баючыся, каб ён ня вырас да столі. У пакой увашоў Ванька К.

—Паабедалі? Добра сёньня ў вас! А вось у нас х л а п ц ы ня хочуць гэтага наладжваць.—Ён шкадуючы і зайздросна гледзячы на іх і сеў на табурэтцы.

— Якая сёньня ідзе карціна ў кіно?

Трэба было-б організаваць колектыўны паход — прагаварыў Бунін. Ванька паўняўся і вышаў з пакою, панёсшы нейкую занодістую думку

Комуна адпачывала. Усё агульнажыцьцё наглядала за біеньнем яе пульсу. Пульс біў моцна, з водгаласам! Перабояў ня было!

Цішан Палын.



Зьверху уніз: Старшыня „ВСНГ“ брыгады-комуны—Пепік. Старшыня „ЦВК“ —Хамскі. Нам. старшыні „ЦВК“—Бунін.

НІ КРОКУ НАЗАД АД КАНТРОЛЬНЫХ ЛІЧБАЎ

НЕВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ—ЗЛАЧЫНСТВА ПЕРАД ПАРТЫЯЙ І РАБОЧАЙ КЛЯСАЙ

48 тысяч рублёў страты

Гомельскі паравозна-рамонтны завод імя **Ланцуцкага** ня выканаў за першы квартал 1929-30 году сваёй вытворчай програмы на 13 проц

Па капітальнаму рамонту ня зроблена 6 паравозаў, па сярэдняму рамонту програма выканана толькі на 23 проц. Выдатак на сярэдні рамонт паравозу выражаецца ў суме 3000 рублёў, а завод затрачвае амаль у два разы болей. Па каштарысу на першы квартал гаспадарчага году павінны былі адрамантаваць капітальным рамонтам 12 вагонаў, а адрамантавалі толькі 7.

Недавыкананьне прамфінпляну тлумачыцца недастатковай падрыхтоўкай да пераходу на новы гаспадарчы год і пераходу з капітальнага на сярэдні рамонт. Каштарыс на рабочых складзен несваечасова,—разнабой рамантаваных сэрый паравозаў і непрыстасаванасьць заводу да усіх сэрый, недахоп высокакваліфікаваных рабочых, асабліва кавалёў і такароў,—усё гэта, відома, адбілася на выкананьні прамфінпляну. Адміністрацыя недастаткова кіравала цэхамі, дрэнна адносілася да сваіх абавязкаў. Пытаньне аб адзінаначальлі на заводзе не ўсьвядомлена. Завод яшчэ да гэтага часу ня мае сваёй пяцігодкі. На сёньнешні дзень завод мае на 48 тысяч рублёў страты.

Усім грамадзкім, комсамольскім, партыйным організацыям заводу неадкладна трэба высьветліць прычыны ганебнага невыкананьня прамфінпляну за першы квартал. Трэба прыцягнуць да адказнасьці тых, хто пядбайна адносіцца да вытворчасьці.

І. Ц.

Перавал за 20 і 200

Вестка аб тым, што промфінплян за сьнежань выкананы ўсяго на 44 проц. ускалыхнула ўвесь рабочы колектыў менскай фабрыкі «Беларуска». Соцспаборніцтва перашло ў другую больш вышэйшую стадыю. Лік брыгад перавалiў **за 20**, ударнікаў—за 200. Правільны і грабянёвы цэхі перашлі на ўдарную працу.

Пасыпаліся заявы аб добраахвотным павялічаньні норм,—спачатку правільшчыкі, потым фрэзэроўшчыкі, пансоры, паліроўшчыкі, зноў фрэзэроўшчыкі... На ўсіх цэхах закрасавалі чырвоныя і чорныя дошкі, якія зьбіралі вялікі ўраджай: таблыцы штодзённай выпрацоўкі брыгад і асобных удзельнікаў спаборніцтва. Выходзіць бюлетень соцспаборніцтва, які адзначае ўсё добрае і дрэннае, уносіць прапановы і г. д.

...Ажыла культкамісія

Ажыла і культкамісія. Быў праведзен шэраг спэцыяльных вечароў і гутарак, сход уноў прынятых рабочых па пытаньню працдысцыпліны і соцыялістычнага спаборніцтва; вечар ударных брыгад, за шклянкай гарбаты, дзе па пытаньню аб зьмесьце працы ўдарных брыгад выказалася 22 чалавекі; паказальны суд і інш.

На фабрыцы організаваліся тры вытворчыя комуны—па мойцы і паліроўцы. Правільны цэх таксама цалкам перашоў на колектыўную аплату працы. Большасьць комунараў-моладзь—комсамольцы. Усё гэта дало належныя вынікі. У студзені, напрыклад, у асноўным цэху фабрыкі—грабёнёным было выпрацавана 1659 грос цэлюлёідных грабянёў (грос—144 штукі), у сьнежні ўжо 1679 грос і 141 грос галалітавых, а за 10 дзён лютага выпрацавана 793 грос цэлюлёзных грабянёў і 89 з пал. грос галалітавых. Гэта —замест 709 з пал. грос цэлюлёзных грабянёў і 83 грос галалітавых, як прадугледжвалася плянам, што дае 112 проц. па цэлюлёзе і 109 проц. па галаліту.

Усё рабілася бяз вытворчай камісіі

Зпачна горш абстаіць справа ў гузікавым цэху, дзе яшчэ маецца некаторая ненормальнасьць ва ўзаемаадносінах майстроў, зьмен і дзе ўдарныя брыгады працуюць слаба. Але і ў гэтым цэху ў апошні час наглядаецца **пералом у бок палепшаньня работы.** Так, калі ў сьнежані ў сярэднім па гузіках было выпрацавана 25 проц. прамфінпляну, дык у студзені ўжо маем 42 проц.

Трэба адзначыць ня зусім здавальняючую працу фабрычна-заводзкай камісіі, міма і бяз удзелу якое адбылося ўсё вышэй адзначанае. Комсамольская ячэйка, а таксама і ўся моладзь удзельнічае ва ўсіх гэтых мерапрыемствах, **але, ва ўсякім разе, як радавыя але не як організатары і застрэльшчыкі.**

Наогул, у работу ўцягнуты адзін сакратар ячэйкі і зусім слаба астатнія сябры бюро. Ёсьць вялікая колькасьць адміністрацыйных спагнаньняў на партыйцаў і комсамольцаў; назіраюцца і прагулы, на што як бюро ячэйкі КП(б)Б, гэтак і КСМ рэагуюць дрэнна.

І. Фішбэйн.

Трохмесячнік беларускай і нацменаўскай пролеткультуры

Прэч халтуру з савецкай сцэны!

РЭПЭРТУАР: ТЭАТРАЎ, ОПЭР І ДРАМАТЫЧНЫХ ГУРТКОЎ ЗАСЬМЕЧАНЫ ІДЭОЛЁГІЧНА ШКОДНЫМІ І СТАРЫМІ П'ЕСАМІ

ВІТАЮЧЫ ПАЧЫН БДТ-2, МЫ ЗАКЛІКАЕМ ІНШЫЯ ТЭАТРЫ ПАДХАПІЦЬ ГЭТЫ ПАЧЫН Ў ПРАВЯДЗЕНЬНІ ТРОХМЕСЯЧНІКУ

МЫ чакаем ад пролетарскіх поэтаў, пісьменьнікаў і драматургаў новых—сугучных сёньняшнім тэмпам соцыялістычнага будаўніцтва п'ес, песень, частушак, опэр для тэатраў і клюбаў

БДАТ-2—У ПАХОДЗЕ

(Віцебск)

Баявы пахоч ЛКСМБ за трохмесячнік беларускай пролетарскай культуры і культуры нацменшасьцяў хаця распачаўся з спазьненьнем, але знашоў свой водгук у адным з цэнтральных рассаднікаў беларускага мастацтва БДАТ-2.

Зараз у тэатры організавана некалькі акторскіх брыгад, як-та: брыгада скакуноў, сьпевакоў, дэклямātараў і ін.п., якія, не гледзячы на сваю перагружанасьць штодзённай работай, з вялікай ахвотаю дадаткова рыхтуюцца па сваіх брыгадах і робяць выезды ў рабочыя клюбы заводаў для правядзеньня культурна-масавай работы. За гэты час было 7 выездаў. Напрыклад, выяжджалі на панчошную фабрыку, завод „Профінтэрн" і іншыя прадпрыемствы.

Быў таксама наладжан адзін выезд у прыгарадны рабочы раён „Пралетарская Слабада" для пастаноўкі п'есы „Каля тэрасы".

Побач з гэтым організавана брыгада па праверцы работы клюбных драмгурткоў—мэта якіх выкарчоўваць пануючую халтуру на сцэне рабочых клюбаў. Ужыты захады па забесьпячэньню рабочых клюбаў адпаведнай клюбнай пастаноўкай. Для гэтага камісія тэатру па правядзеньню трохмесячніку ўключыла ў свой плян—перапрацаваць п'есу „Маёмасьць".

І, галоўнае—падрыхтаваць звышплянава ва ўдарным парадку клюбную маладзёжную пастаноўку, якая-б была маладзёжнай як па форме, так і па зьместу, адказваючы на тыя лёзунгі і мерапрыемствы, якія завастрыў у сваім паходзе комсамол. З апошнім пунктам пакуль што справа абстаіць ня зусім добра, ня ўжыта яшчэ ніякіх захадаў ні дырэкцыяй, ні мастацкай радай.

Бальшавіцкім тэмпам тэатр павінен узяцца за выкананьне задач, пастаўленых трохмесячнікам у перабудове сваёй работы, у барацьбе за мастацтва нацыянальнае па форме і пралетарскае па зьместу, бязьлітасна выкарчоўваючы беларускі нацыянал-дэмократызм, тэорыю „самабытнасьці" і іншыя варожыя тэндэнцыі, ствараючы сапраўдны пролетарскі тэатр, які-б адбіваў усе тэмпы будаўніцтва соцыялізму.

Наш лёзунг:—Ніводнага працаўніка БДАТ-2, які-б ня прымаў удзел у трохмесячніку беларускай і нацменаўскай пролетарскай культуры.

Ул Стэльмах.

На чорную дошку

— У Менскім ЦРК па трохмесячніку беларускай і нацменаўскай пролетарскай культуры нічога ня робяць. Толькі гэтымі днямі ставілася пытаньне на сходзе, але бюро колектыву яшчэ ня выпрацавала падрабязнага пляну ў правядзеньні трохмесячніку. У галіне беларусізацыі МЦРК адна з адсталых устаноў. Усе на сходах галасуюць за беларусізацыю, а на справе не праводзяць яе.

МЕРЭН.

— Петрыкаўскі райком (Мазыршчына) комсамолу толькі цяпер стаў праводзіць некаторую работу па трохмесячніку. Ячэйкі яшчэ нічога практычнага не зрабілі.

ВОЦАТ.

— Дукорская ячэйка (Меншчына) КСМ на сваім сходзе пытаньня аб трохмесячніку ня ставіла і нічога яшчэ не пачынала рабіць.

ВЕДАЮЧЫ.

— Лоеўскі райком (Гомельшчына) не разгарнуў як належыць работу па правядзеньню трохмесячніка. На райкоме гэта пытаньне недастаткова асьвятлена, усё рабілася са спазьненьнем. Ёсьць пагроза зрыву трохмесячніку ў раёне.

ПАЎЛЮКОЎ.

— У Бачэйкаўскім сельсавеце, Віцебскай акругі ня ведаюць аб тым, што праводзіцца трохмесячнік. Настаўніцтва і школы нічога ня робяць. Хата-чытальня таксама нічога не прадпрымае.

ГЛІКМАН.

— У Плешчаніцкім раёне (Меншчына) трохмесячнік праходзіць дрэнна. Райком комсамолу, комсамольскія ячэйкі і другія ўстановы абмежаваліся толькі складаньнем плянаў, хоць і апошнія ня ўсюды ёсьць. Групы „лёгкай кавалерыі" не дапамагаюць справе праверкі ходу трохмесячніку.

ЧАЧОТКА.

Пазбаўце нас ад такой опэры

Зараз у Слуцку знаходзіцца опэра. Опэра ў сваім рэпэртуары ня мае нічога сучаснага. Такія паказы ў тэатры ні ў якім разе ня могуць задаволіць гледача.

Слуцкі РГК на паседжаньні бюро разглядзеў пытаньне аб гэтай опэры і адзначыў:

— Зьмест рэпэртуару опэры зьяўляецца ідэолёгічна нявытрыманым, адбіваючы гнілы быт сівой мінуўшчыны, як напрыклад „Севільскі цырульнік", гэта опэра сваім рэпэртуарам прыносіць толькі шкоду для працоўнай масы, ідэалізуючы старасьветчыну не ў такім сэнсе, як гэта патрэбна зараз. Выходзячы з гэтага, бюро РГК узьняло пытаньне перад райкомам КП(б)Б, фракцыяй гарсавету аб прыняцьці належных мер супроць такой опэры, якая нічога агульнага ня мае з соцыялістычным будаўніцтвам.

Трэба таксама спыніцца і на некаторых артыстых опэры, якія ня толькі не стараюцца ўнесьці новае сучаснае пролетарскае ў свой рэпэртуар, а толькі п'янствуюць, што ні ў якім разе не сумяшчаецца з назвай савецкага актора.

Савецкая грамадзкасьць павінна заняцца справай дапамогі ачысьціць шэрагі акторскага складу ад варожага разлажыўшагася элемэнту, уліўшы туды новы струмень рабочай і батрацка-бядняцкой моладзі.

ГОЗЭНПУД.

За дрэнь вялікія грошы

Зараз у мястэчку Касьцюковічах знаходзіцца украінская трупа артыстых імя Грынчанкі.

Наплыў у клюб гледачоў вялікі.

Акторы выконваюць свае ролі даволі добра. Але трэба сказаць, што рэпэртуар гэтай трупы ня зусім сучасны. Ён не адбівае важнейшых момантаў сёньнешняга дню.

Трэба таксама спыніцца і на тым, што ў тэатры цэны на білеты вельмі дарагія—недаступныя для бедноты.

Для таго, каб тэатр і наогул мастацтва прыблізіць да рабочай і бядняцка-батрацкай масы, трэба, каб рэпэртуар яго адпавядаў сучаснасьці.

Вясковы Сьмяльчак.

Слова за Наркамасьветы

Абяцаньні нас не задавальняюць

Ужо больш году, як грамадзкія і савецкія ўстановы, у тым ліку і Наркамасьветы ведаюць аб існаваньні Беларускага Рабочага Тэатру.

Ужо больш двух год, як гэты малады тэатр працуе амаль без усякае дапамогі належных устаноў, абслугоўваючы ня толькі



Па ціхіх хвалях цыркуляраў...

Менскія, але і другіх гарадоў і мястэчак рабочыя і чырвонаармейскія клюбы.

У пачатку 1929 году вельмі шмат гаварылася аб гэтым тэатры, аб яго дасягненьнях, аб яго сучасным рэпэртуары, аб яго самадзейнасьці.

Зараз тэатр стаіць напярэдадні развалу. Сябры праўленьня тэатру штодня абіваюць парогі Наркамасьветы, просячы дапамогі, ня гледзячы на тое, што пяцігадовым плянам прадугледжана організацыя на Беларусі яшчэ 12 дзяржаўных тэатраў, галоўным чынам вандроўных. Наркамасьветы часткова сьвядома дапушчае развал гэтага маладога тэатру.

Шмат сіл і энэргіі было пакладзена сябрамі тэатру на стварэньне моцнага колектыву, на тое, каб унесьці ў тэатр сучаснае пролетарскае мастацтва.

І ўрэшце, што мы бачым? Народны Камісарыят Асьветы БССР ня толькі не дапамог гэтаму маладому каштоўнаму тэатру падняцца вышэй у сваім разьвіцьці, але нават не зьвяртае ўвагі на тое, што тэатру са дня на дзень пагражае небясьпека развалу.

Праводзімы трохмесячнік беларускай і нацменаўскай пролетарскай культуры павінен зрабіць значны пералом ва ўсёй рабоце тэатру, а таксама і Наркамасьветы павінен у першую чаргу забясьпечыць тэатр усім неабходным для таго, каб ён мог існаваць і будаваць новае пролетарскае мастацтва.

Л. А—скі.

За 5 год выпусьцілі 5 спэцаў

Выгнаць чужакоў з мастацкіх установаў

Ужо пяць год працуе адзіная мастацкая установа на Беларусі—Віцебскі Дзяржаўны Мастацкі тэхнікум. Кожны год грамадзкая думка біла трывогу аб ненармальнасьцях у яго працы. Але „начальства" з Наркамасьветы сваім „благаслаўленьнем" глушыла трывогу грамадзкасьці, а „назойлівых" выганяла з „блажэннага вульля".

Пяць год працуе Мастацкі Тэхнікум без програм, без навучальнага пляну. Пяць год трацяцца дзяржаўныя сродкі, калечыцца пролетарская моладзь на мастацтве „хрысьціянства", старажытнасьці, сярэднявякоўя і да нашых дзён вывучаюцца ўсе саборы, цэрквы і касьцёлы з іх абразамі.

І дзіву даешся, што на 13-годзе кастрычнікавай рэволюцыі яшчэ існуюць на Беларусі навучальныя установы без мэтавых установак дагістарычнай эпохі.

Возьмем, напрыклад, трывожныя сыгналы за 1928 год у газэтах „Савецкай Беларусі" і „Заря Запада". Пасья гэтага нічога станоўчага не зрабілі, толькі... зьмянілі адміністратара.



Вымесьці ўсё непатрэбнае

Адчыненьне яўрэйскага аддзяленьня для выяўленчага мастацтва і запрашэньне вядомага мастака ЮДОВІЧА з боку формальнага і юрыдычнага „аформлена як найлепей, а „воз и ныне там".

Скульптурна-разьбярны аддзел выпусьціў за пяць год існаваньня тэхнікуму трох разьбяроў, якія зараз працуюць у сямігодках у якасьці выкладчыкаў графічнага мастацтва.

Зараз у тэхнікуме яшчэ сядзяць некаторыя „прыхільнікі" Кастрычніка і думаюць ды гадаюць аб большай колькасьці гадзін, ды аб 40 градуснай і „блаженстви" у „мастацкім вульлі".

Дылетантам „аматарам мастацтва для мастацтва" не павінна быць месца ў дзяржаўнай мастацкай установе.

В—аМ.

„Кік-вок і Наполеон" у Смалявіцкім нардоме

15-га лютага ў Смалявічах адбыўся літаратурны вечар, прысьвечаны 3-х месячніку беларускай пролетарскай культуры. Пасьля літаратурнага выступленьня белаппаўцаў у Смалявіцкім нардоме, дзякуючы казённым адносінам да справы з боку райкому камсамолу і інспэктара Райана мастацкая частка, якая склалася з выступленьняў хору сямігодкі і струннага гуртка пры саюзе саўгандльслужачых—не вытрымоўвае абсалютна ніякай крытыкі.

Хор выступіў з абсалютна не адпавядаючай нашаму часу песьняй „Гэй ты Нёман рака"... старым, накладзеным на музыку, адраджэнскім вершам Цішкі Гартнага, ды валачобнай песьняй „Вясна красна на двара".

Струнны гурток пачаў сваё выступленьне беларускай Марсэльезай, але другім нумарам «скромнай праграмы» як гучала ад кіраўніка са сцэны, быў «Новый американский танец „Кік-вок", сьледам за „кіквокам" былі выкананы „бубенцы", сьледам за „бубенцамі"—„кузнецы", супроць якіх выступала ў свой час „Комсомольская Правда", расцэньваючы гэту песьню як халтуру, напісаную на матыў песьні шансонэтак: „Мы шансонетки стреляем метко"..

І нарэшце струнны гурток «задаволіў запатрабаваньні мас" трыумфальным маршам „Напалеон" (!!!)

Выкананьне такой халтуры ў Смалявіцкім нардоме ў той час, калі мы праводзім змаганьне за новую культуру прымусіла нас зьвярнуцца з рэзкім пратэстам абураньня супроць такіх, з дазваленьня сказаць „мастацкіх парлаў". Аднак таварышы, са струннага гуртку на нашы парады зьмяніць шлях свае дзейнасьці аднагалосна заявілі:

Шлях наш правільны і мы пойдзем ім і далей. А калі „прадстаўнікі цэнтру" будуць нам рабіць такія абвінавачваньні, дык мы распусьцім свой гурток...

На наш погляд лепш распусьціць гурток, чым ён займаўся-б і мазоліў пальцы на вывучэньні такой з дазваленьня сказаць „культуры".

Але з другога боку перад агітпропам ЦК ЛКСМБ стаіць задача ў тэрміновым парадку скласьці прыкладныя рэкамэндацыйныя рэпэртуары для нашых харавых і струнных гурткоў, якія да гэтага часу „дзяруць галасы", „мазоляць пальцы" і нясуць у масы „культуру" вельмі нізкай якасьці. Мы ўпэўнены, што такое зьявішча ёсьць ні ў адных толькі Смалявічах.

А таварышом са Смалявіцкага струннага гуртку няма чаго абражацца за тое, што мы назвалі іх рэпэртуар халтурай, бо ён і на справе ёю зьяўляецца.

Наша парада ўсім струнным і харавым гурткам — ісьці па лініі найбольшага супраціўленьня, не паддавацца і ня выкарыстоўваць пазадзьдзі буржуазнай культуры, а несьці ў масы працоўных сапраўды рэволюцыйны рэпэртуар.

Ад імя групы белаппаўцаў

Іл. Барашка.

ДА 12 ГАДАВІНЫ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Дамо новых чырвоных камандзіраў

Зробім гурткі ТСА-Авіяхэму дапаможнікамі ў падрыхтоўцы кадраў працоўнай моладзі для вайсковых школ

Працоўная моладзь— у вайсковыя школы

У нашай краіне на чале ўлады стаіць пролетарыят, наша Чырвоная армія—зброя пролетарскай дыктатуры. Адсюль пытаньне аб забясьпечаньні каманднага складу Чырвонай арміі ў пераважнай большасьці рабочымі зьяўляецца зусім неабходным. Пагэтаму партыя, комсамол, Рэвалюцыйны Ваенны Савет Слюзу з году ў год указваюць на неабходнасьць павялічэньня рабочай праслойкі ў складзе моладзі, якая ідзе ў вайсковыя школы. У наборы 1929 году мы маем значныя дасягненьні. У агульным лік рабочых, прынятых у школы, складаў 67 проц., у асобных школах ён даходзіў да 80 і 85 проц. Гэтыя факты яскрава сьведчаць аб тэй вялізарнай увазе і клопаце, якія рабочая кляса ўдзяляе сваёй Чырвонай арміі. Гэтыя факты побач з такой зьявай, як магутны паток індывідуальных і колектыўных заяў аб жаданьні добраахвотна ўступіць у Асобную Далёка-Усходнюю Чырвоную армію, сьведчаць аб цеснай сувязі пролетарыяту з Чырвонай арміяй, аб рэволюцыйна-баявым настроі шырокіх рабочых мас, якія гатовы ў кожную хвіліну стаць на абарону савецкай краіны.

Кожны месяц прыносіць нам новыя доказы набліжэньня вайны, асабліва супроць Савецкага Саюзу. Конфлікт на К-У чыгунцы лішні раз пацьвердзіў, што нам заўсёды пагражае імпэрыялістычны напад. Толькі ўпэўніўшыся на горкім вопыце ў нашай вайсковай магутнасьці, кітайскія мілітарыстыя прынялі міралюбівыя прапановы Савецкага Саюзу, а тыя, хто штурхаў іх на конфлікт, не маглі на гэты раз ажыцьцявіць сваіх плянаў.

Чырвоная армія—самая надзейная апора мірнай політыкі Савецкага Саюзу. Чырвоная армія—верны вартаўнік соцыялістычнага будаўніцтва.

Рабочай моладзі трэба аўладаць майстэрствам кіраваньня ўзброенай барацьбой у сучасных складаных умовах, калі арміі абагачаюцца тэхнікай (артылерыя, бронемашыны, танкі, авіяцыя), калі ўжываньне хэмічных сродкаў барацьбы атрымлівае магутнае разьвіцьце.

Мы панесьлі ня мала лішніх і непатрэбных ахвяр у час грамадзянскай вайны з-за здрадніцтва, прадажнасьці, самастойнага анархізму асобных камандзіраў. Нярэдка ў самых адказных штабах гнязьдзілася здрада. Рабочая кляса ў тыя часы прымушана была ісьці на гэтыя „выдаткі“, бо ў яе ня было сваіх камандзіраў, яна прымушана была выкарыстоўваць той каманды склад, які застаўся ад старое царскае арміі. Цяпер рабочая кляса мае сваіх камандзіраў. Рабочая кляса і батрацка-бядняцкае і серадняцкае сялянства павінны мець магчымасьць цьвёрда пакладацца на свой каманды склад. Гэта будзе толькі ў тым выпадку, калі камандзірамі ў нас будуць толькі рабочыя і працоўныя сяляне.

Вось чаму рабочай моладзі трэба ісьці ў вайсковыя школы. Толькі абапіраючыся на кадры камандзіраў, якія вышлі з шэрагаў рабочае клясы, мы здолеем узьняць на яшчэ большую вышыню баяздольнасьць Чырвонай арміі і ўтварыць тым самым надзейную гарантыю нашага мірнага соцыялістычнага будаўніцтва.

А.

Выклікаем!!!

Ячэйка ТСА-Авіяхэму трактарных курсаў станцыі Васілевічы (Гомельшчына) выклікае ячэйку ТСА-Авіяхэму трактарнай школы г. Горак (Аршаншчына) на соцыялістычнае спаборніцтва па наступных пытаньнях:

Вывучэньне маршыроўкі і строю, пабудова калёны і рассыпнога строю, вывучэньне знакаў комскладу, вывучэньне вінтоўкі. Разьведка ў баі і маскіроўка, баявыя надзоры, політработа, орыентоўка топографіі, хэмія на вайне і вывучэньне процівагазу і г. д. і г. д

Таксама ставім пытаньне аб належнай падрыхтоўцы рабочых кадраў для вайсковых школ.

ЧАРНІГАЎ.

Падрыхтуем новыя кадры

Бюро ячэйкі ТСА-Авіяхіму пры фабрыцы „Кастрычнік“ сумесна з комсамольскай ячэйкай організавала вайскова-інструктарскі стралковы гурток, дзе займаецца каля 20 чалавек.

Заняткі праводзяцца нармальна,—два разы ў тыдзень, наведваньне вельмі добрае. За кароткі тэрмін мы маем вялікія посьпехі ў рабоце гэтага гуртка. Калі раней таварышы, якія займаюцца ў гуртку, ня ведалі нават як трэба трымаць вінтоўку, дык цяпер яны добра навучыліся ўладаць ёю і добра страляць. Акрамя тактычных заняткаў праводзяцца і тэорэтычныя. Вось, напрыклад, комсамольская ячэйка правяла гутарку на тэму аб будучай газавай вайне і аб задачах ТСА-Авіяхіму. Пры стралковым гуртку маецца і санітарны гурток „Чырвонага Крыжу“, гэтым гуртком добра зацікаўлены жанчыны, яны добра наведваюць заняткі.

КАГАН.

Нядаўна камандзірамі №-скага палка былі праведзены тактычныя вайсковыя заняткі з насельніцтвам Малакудзенскага і Галоўчынскага сельсаветаў.

Жыхары Малой Кудзіны жадалі захапіць мясцовасьць, але насельніцтва не паддавалася. Тактычныя вайсковыя заняткі прашлі з вялікім уздымам і зацікаўленасьцю з боку старэйшага працоўнага сялянства, былі замацаваны тыя тэорэтычныя веды, якія набываліся у гуртках ТСА-Авіяхіму.

ІВАНОЎ.

Замацоўваюць свае дасягненьні

У сувязі з падрыхтоўкай у вайсковыя школы комсамольская ячэйка ст. Слаўнае МББ чыгункі разгарнула вайсковую работу. Нядаўна быў наладжаны вайсковы паход комсамольцаў. Задачай гэтага паходу было правядзеньне наступальнага і абарончага бою, паказаўшы, як павінна рота ў цэлым выйсьці ў наступленьне, і што павінны рабіць паасобныя аддзяленьні і кожны баец. Гэты паход павінен быў выявіць вайсковыя веды і баяздольнасьць комсамольскай ячэйкі, замацаваць вайсковую работу за ўвесь летні пэрыод.

Паход прайшоў даволі добра, зацікавіў усіх комсамольцаў. Уся ячэйка цалкам удзельнічала ў паходзе, за выключэньнем некалькіх дэзэртыраў, якія спалохаліся цяжкасьцяй паходу.

Усе загады камандзіраў выконваліся чотка, безагаворачна, быццам у баявой абстаноўцы.

Па заканчэньні бою быў зроблен маленькі даклад аб будучай вайне і аб задачах комсамолу ў гэтым.

Хлорэнка.



Бывае часам і такая „праца“

Тэлеграмы

КРЫВАВАЯ БОЙНЯ Ў КІТАІ НЯ СПЫНЯЕЦЦА

У раёне Луньхайскай чыгункі распачаліся баявыя опэрацыі

Чан-Кай-Шы мае намер «працягваць зьнішчэньне ўсіх рэакцыйных элемэнтаў ва ўсёй краіне»

ШАНХАЙ, 16-2. Рэйтэр паведамляе, што ў раёне Луньхайскай чыгункі распачаліся баявыя опэрацыі.

ПЕКІН, 16 2. Кітайская газэта „Сінь-Шэн Бао“ паведамляе, што Ен-Сі-Шан паслаў тэлеграму Чан-Кай-Шы са згоды Фынь-Юй-Сяна. Ен-Сі-Шан затрымлівае агалашэньне сваёй дэклярацыі, чакаючы адказу Чжан-Сюэ Ляна, які паслаў ужо прадстаўніка ў рэзыдэнцыю Ен-Сі-Шана. Ен-Сі-Шан, Хань-Фу-Чу, Шы-Ю-Шан і лідэры былога Гомінцьзэну дзейнічаюць супольна. У свой чарод Нанкін згрупоўвае 10 дывізій на поўдні Цянцьзін-Пукоўскай чыгункі.

У адказ на прапанову Ен-Сі-Шана Чан-Кай-Шы заявіў: „Ніякія паклёпы і ніякія пагрозы ня могуць прымусіць яго пакінуць дзяржаўных і партыйных спраў“. У сучасны момант ён мае намер „працягваць зьнішчэньне ўсіх рэакцыйных элемэнтаў ва ўсёй краіне“. Заява Чан-Кай-Шы, зробленай у такой катэгарычнай форме, надаюць у політычных колах вялікае значэньне.

ЛЁНДАН, 16-2. Пекінскі карэспандэнт „Манчэстэр Гардыян“ і шанхайскі карэспондэнт „Таймс“ паведамляюць, што магчыма новае выступленьне паўночных генэралаў супроць Нанкіну. Паводле слоў карэспондэнтаў, Ен-Сі-Шан тэлеграфаваў Чан-Кай-Шы і прапанаваў яму разам падацца ў адстаўку і выехаць.

Жахі голаду

Хутка ў Шэнсі не застанецца ніводнага жывога чалавека

ПЭЙПІН, 16-ІІ. Корэспондэнт „Такун Бао“ паведамляе, што голад у Шэнсі набыў яшчэ больш пагражаючыя разьмеры з прычыны вялікага холаду. Паводле слоў карэспондэнта, хутка не застанецца ніводнага жывога чалавека ва ўсёй правінцыі.

ГАНАРОВАЯ ВАРТА КАЛЯ ДАМАВІНЫ ЭРНЭСТА МЭЙЕРА

У Бэрліне ад сухот памёр вядомы комуністы, шматгадовы член політбюро, асабісты таварыш Лібкнэхта, організатар спартакаўскага руху тав. Эрнест Мэйер.



НА ЗДЫМКУ: 2-га лютага ў залі ЦК компартыі Нямеччыны каля дамавіны стаіць ганаровая варта з членаў забароненага саюзу чырвоных франтавікоў.

„Ганеньняў на рэлігію ў СССР ніколі ня было і няма“

«Усё, што піша замежны друк адносна жорсткасьцяй, якія быццам-бы утвараюцца савецкай уладай у адносінах да асобных служак рэлігійнага культу,—гаворыць мітрапаліт Сяргей,—ёсьць толькі самая ганебная безпадстаўная хлусьня»

Прадстаўнікі савецкага друку зьвярнуліся з шэрагам пытаньняў да Мітрапаліта Сяргея і прысутнічаўшых пры гутарцы членаў Сіноду (Сэрафім, мітрапаліт Саратаўскі, Аляксей, архіепіскоп Хупінскі, Філіп, архіепіскоп Зьвінегародзкі і Кірыл, епіскоп Арэха-Зуеўскі).

Адказваючы на зададзеныя пытаньні мітрапаліт Сяргей і Сінод заявілі: **„Ганеньняў на рэлігію ў СССР ніколі ня было і няма. Споведзь любой вэры ўпаўне вольная і ніякім дзяржаўным органам не перасьледваецца. Зачыненьне-ж некаторых цэркваў утвараецца не па ініцыятыве ўлады, а па жаданьню насельніцтва, а ў іншых выпадках, нават па пастанове саміх веруючых“.**

На пытаньне: ці адпавядаюць сапраўднасьці весткі, якія зьмяшчаюцца ў замежным друку адносна жорсткасьцяй, якія быццам-бы ўтвараюцца савецкай уладай у адносінах да асобных сьвяшчэнна-служыцеляў мітрапаліт Сяргей адказаў:

— **Ні ў якой ступені гэтыя весткі не адпавядаюць сапраўднасьці.** Усё гэта адна толькі выдумка, хлусьня, зусім няварта сур'ёзных людзей. Да адказнасьці прыцягваюцца асобныя сьвяшчэнна-служыцелі не за рэлігійную дзейнасьць, а па абвінавачваньню ў тых або іншых анты-урадавых дзеяньнях.

Выступленьні Рымскага папы і архіепіскопа Кентэрберыйскага—гэта адна хлусьня, якая накіравана супроць Савецкага Саюзу. Усё гэта зьяўляецца нічым іншым, як падштурхоўваньнем паствы на новую інтэрвэнцыю, ад якой так многа пацярпела Расія.

15 сакавіка адчыняюцца курсы кіно-мэханікаў

Умовы прыёму на курсы

Белдзяржкіно і Белкоопсаюз організуюць у гор. Менску курсы па падрыхтоўцы кіно-мэханікаў. Курсы маюць мэтаю падрыхтаваць кіно-мэханікаў, галоўным чынам, для вясковай кіно сеткі: стацыянарных кіно-ўстановак і перасовак, а таксама ўзьняць грамадзка-політычны ўзровень іх, як політасьвет-працаўнікоў на вёсцы.

Курсы адчыняюцца з 15-га сакавіка 19 0 г. тэрмінам на 6 мес. і разьлічаны на 75 чалавек.

На курсы прымаюцца асобы абодвых палоў ва ўзросьце ад 18 да 30 год. Ад паступаючых патрабуецца дастатковае палітычнае разьвіцьцё і агульная асьвета, прыкладна ў аб'ёме курсу 7-мі годкі, але ня ніжэй курсу 4-х гадовых працоўных школ ёй раўных па праграме.

УВАГА: у першую чаргу на курсы будуць залічаны члены і кандыдаты КП(б)Б, ЛКСМБ, рабочыя, батракі, калгасьнікі і бядняки.

Да заявы аб залічэньні на курсы неабходна прылажыць наступныя дакумэнты: а) камандыроўку, альбо рэкомэндацыю партыйных, савецкіх профэсыянальных і коопэрацыйных організацый, б) пасьведчаньне аб соцыяльным і маемасным становішчы як паступаючага таксама і яго бацькоў, в) аб асьвеце, г) аб адносінах да вайсковай службы — для мужчын. Для членаў партыі, ЛКСМ, профсаюзаў у заявах паказаць свой стаж.

Навучальны плян курсаў падзяляецца: а) на тэорэтычную падрыхтоўку, у якую ўваходзяць: фізыка, электротэхніка, беларусазнаўства, белмова, кінематографія і кіно-тэхніка, політпрасьветпраца, фото-радыё і б) на практычную—элемэнты сьлясарнай працы, рамонт кіно-апаратуры, кіно-праца на перасоўках і стацыянарках, радыё-ўстаноўкі.

На ўвесь час навучаньня на курсах курсанты забясьпечваюцца грашовай стыпэндыяй у разьмеры 40 р. на месяц, патрэбнай літаратурай і навучальнымі падручнікамі. З за адсутнасьці памяшканьня-інтэрнат пры курсах організаваны ня будзе, таксама ня будзе аплачаны праезд у Менск на курсы.

Заявы прымае Белдзяржкіно (Менск, Рэвалюцыйная, 4) да 1-га сакавіка г. г. Там-жа даюцца дадатковыя даведкі аб курсах.

Залічэньне на курсы праводзіцца спэцыяльнай камісіяй у складзе прадстаўнікоў: ад ЦК ЛКСМБ, Наркампрацы, Белдзяржкіно, Культаддзелу ЦСПСБ і Белкоопсаюзу, па заявах і дакумэнтах, без асобных іспытаў.

Аб выніках прыёму кожны падаўшы заяву будзе паведамлены асабіста па паказанаму ім паштоваму адрасу.

З агульнага ліку курсантаў браніруюцца: а) 30 чалавек за Белкоопсоюзам, якія паступаюць па камандыроўках Райсаюзаў, Аддзяленьняў БК па разьмеркаваньню апошняга: ад Магілеўскай акругі—9 чалавек і ад усіх інш.—па 3 чал. б) за Наркампрацы—15 чалавек з ліку беспрацоўных, в) за ЦСПСБ—15 чалавек.

УВАГА: Паказаныя організацыі бяруць на сябе абавязак нясеньня выдаткаў на ўтрыманьне курсаў і выдачу стыпэндыяў, адпаведна забраніраванаму ліку.

Адказны рэдактар
Рэдколегія

Менск, друкарня БДВ.

Галоўлітбел № 599